Аддзел па адукацыі
Камянецкага райвыканкама
ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г.Высокае”

# ПРАЕКТ

# “Адкрыты раённы дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына”

Рэцэнзенты:
метадыст, педагог дадатковай адукацыі ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае” Л.Р. Дудар,
метадыст раённага вучэбна- метадычнага кабінета адзела па адукацыі Камянецкага райвыканкама А.У. Вамбольд

Аўтары-складальнікі:
А.М. Зайцева, педагог ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”, кіраўнік узорнага клуба аматараў фальклору “Катрынка”;
А.М. Краўчук, педагог ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”, хормайстар узорнага клуба аматараў фальклору “Катрынка”.
Н.А. Сафроненка, педагог ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”, хормайстар узорнага клуба аматараў фальклору “Катрынка”.

Рэкамендавана
метадычным аб’яднаннем дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”
“23” студзеня 2019 г., пратакол № 3

У дадзенай рабоце апісаны формы і метады грамадска-патрыятычнага выхавання навучэнцаў праз вывучэнне фальклорнай спадчыны малой радзімы і фестывальную дзейнасць.

Матэрыял будзе карысны для метадыстаў і педагогаў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, якія займаюцца фальклорным напрамкам.

Матэрыял носіць практычны характар.

© Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае” аддзела па адукацыі Камянецкага райвыканкама

# ЗМЕСТ


1. УВОДЗІНЫ……………………………………………………... 2 стар.
2. Інфармацыйная характарыстыка праекта:…………………… 3 стар.
   2.1 Назва праекта
   2.2 Актуальнасць праекта
   2.3 Праблемная сітуацыя
   2.4 Мэты і задачы праекта
   2.5 Тып праекта
   2.6 Метады работы
   2.7 Формы работы
   2.8 Прагназуемы вынік
   2.9 Терміны рэалізацыі праекта
   2.10 Удзельнікі праекта
3. Змест праекта……………………………………………… 8 стар.
4. План рэалізацыі праекта…………………………………….. 9 стар.
5. Сацыяльнае партнёрства……………………………….…..... 10 стар.
6. Фінансава-эканамічнае абгрунтаванне праекта……………… 10 стар.
7. Маніторынг эфектыўнасці рэалізацыі праекта…………….…..... 10 стар.
8. Патэнцыял развіцця праекта…………………………………... 12 стар.
9. Літаратура…………………………………………………...... 13 стар.
10. Дадатак 1……………………………………………………... 14 стар.
11. Дадатак 2……………………………………………………... 17 стар.
12. Дадатак 2……………………………………………………... 22 стар.

# 1. УВОДЗІНЫ

Далучэнне да беларускай традыцыйнай культуры адыгрывае адну з ключавых роляў ў стварэнні сістэмы патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Любоў да малой радзімы паўстае як адна з найбольш характэрных рыс беларускага нацыянальнага характару, займае адно з самых важных месцаў у структуры патрыятычных пачуццяў, вызначае пэўную спецыфіку формаў праяўлення патрыятызму, што абавязкова павінна быць улічана ў працэсе рэалізацыі патрыятычнага выхавання маладога пакалення.

Знаёмства з традыцыйнымі абрадамі сваёй малой радзімы пашырае ўяўленне аб народнай мудрасці, дазваляе глыбей перадаць нацыянальную народную характарнасць музычна-паэтычных вобразаў, рэканстукцыя абрадаў дае магчымасць фізічнай і псіхалагічнай разрадкі.

Адной з найбольш распаўсюджаных і эфектыўных масавых формаў перадачы сацыякультурнага вопыту пакаленняў з’яўляецца фестываль.

Ад іншых відаў культурных мерапрыемстваў (свята, канцэрт, паказ, агляд, конкурс, шоў-праграма, іншая мастацкая імпрэза) адрозніваецца разнастайнасцю праграмы, маштабнасцю, шырынёй складу ўдзельнікаў, а таксама грунтоўнасцю, значнасцю мэт, якія ставяцца арганізатарамі пад час яго правядзення.

Раённы дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына” ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае” стаў традыцыйным.

Вытокам фестываля з’яўляецца фальклорнае свята “Спадчына” (2002 год) і раённы фальклорны фестываль “Святочны кірмаш” (2003 год), якія пазней былі рэарганізаваны ў раённы дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына”. Ён праводзіўся праз два-тры гады (дадатак 3).

На падставе вопыту правядзення фестывалю быў распрацаваны праект “Адкрыты раённы дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына”.

Актуальнасць дадзенага праекту абумоўлена магчымасцю прывіваць любоў маладога пакалення да фальклору, цікавасць і павагу да сваіх нацыянальных вытокаў – гэта спрыяе не толькі эстэтычнаму, але, перш за ўсё, грамадска-патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў.




*Калектыў Дзмітравічскай сярэдняй школы, раённы дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына” (2017 год)*

## 2. ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЕКТА

**2.1 Назва праекта:** “Адкрыты раённы дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына”.




*Эмблема фестывалю*

**2.2 Актуальнасць**. Адной з важнейшых задач сучаснасці з’яўляецца выхаванне высокай духоўнасці, маральнасці асобы, гатоўнасці авалодваць культурнымі агульначалавечымі дасягненнямі, а таксама развіццё здольнасці захоўваць і творча памнажаць нацыянальную спадчыну.

Краязнаўчая і этнаграфічная дзейнасць, вывучэнне рэгіянальных фальклорных традыцый і абрадаў даюць магчымасць навучэнцам глыбей пазнёміцца з родным краем, мінулым сваёй краіны, пачынаючы з малой радзімы, далучыцца да культурных, духоўна-маральных, працоўных традыцый нашага народа.

Існуе цэлы шэраг формаў і спосабаў асваення фальклорных традыцый, спасціжэння і пранікнення ў сутнасць народнай культуры, прапаганды і папулярызацыі яе лепшых узораў. Адной з такіх формаў з’яўляецца фальклорны фестываль.

Галоўная ідэя праекта “Адкрыты раённы дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына” заключаецца ў тым, што ў цяперашніх умовах актуальным становіцца вывучэнне, зберажэнне, пераемнасць рэгіянальных народных традыцый дзецьмі і моладдзю. З дапамогай далучэння да абрадаў, музычнага фальклору, побытавых танцаў, рамёстваў і прадметаў дэкаратыўна-побытавага мастацтва малой радзімы фарміруецца сістэма ўяўленняў і поглядаў, з’яўляецца ўнутраная патрэба ў спазнанні і зберажэнні гісторыі свайго роду, сям’і, народа, прадаўжэнні традыцый беларусаў.

**2.3 Праблемная сітуацыя.**

Аналіз навакольнай рэчаіснасці выявіў наступныя з’явы сацыяльнага і прафесійнага плана, на ліквідацыю якіх накіравана дзейнасць у рамках праекта:

– адсутнасць цікавасці дзяцей і моладзі да рэгіянальнага аўтэнтычнага фальклору і традыцыйнай беларускай культуры;
– тэндэнцыя да парушэння культурных сувязей паміж пакаленнямі;

– уплыў заходняй масавай культуры і замена традыцыйных нацыянальных каштоўнасцей.

З кожным годам усё менш становіцца носьбітаў вясковай беларускай культуры, знікаюць традыцыі і прадметы побыту, якія былі звыклыя для беларусаў яшчэ не так даўно, у сярэдзіне XX стагоддзя. Дзейнасць па захаванні матэрыяльных і духоўных нацыянальных каштоўнасцей даўніны вядзецца, але неабходнасць удзелу ў такой дзейнасці маладога пакалення відавочная.

Дзіцячы фальклорны фестываль "Спадчына" – гэта фестываль з даўнімі, сфармаванымі і ўстоянымі традыцыямі. Ён нязменна збірае фальклорныя калектывы з розных устаноў адукацыі і гасцей фестываля, падтрымліваючы, такім чынам, іх творчы патэнцыял. На фествалі вырашаюцца задачы папулярызацыі і прапаганды фальклорных традыцый, прадстаўлення іх шырокаму колу слухачоў, аматараў і знатакоў народнага мастацтва.

Вядома ж, пры правядзенні будучых дзіцячых фальклорных фестываляў шматгадовы вопыт павінен улічвацца. Але, разам з тым, павінны ўлічвацца і асаблівасці сучаснага этапу развіцця фальклорнага руху. Спецыфіка сучаснага этапу звароту мастацкай практыкі да фальклору складаецца ў тым, што да цяперашняга часу, разам з сыходам з жыцця носьбітаў народнай традыцыі, знікае і той тып фальклорных калектываў, якія прынята называць этнаграфічнымі (аўтэнтычнымі). Новае пакаленне ўдзельнікаў гэтых калектываў валодае толькі малой часткай уласнай традыцыі і часцяком арыентуецца на так званы "агульнабеларускі" рэпертуар і аўтарскую песню. Пры гэтым адбываецца страта якасцяў і выканальніцкіх асаблівасцяў калектыву этнаграфічнага тыпу.

Такое становішча выклікае неабходнасць пастаноўкі перад арганізатарамі і ўдзельнікамі фестывалю новых задач, якія вызначаюцца агульнай мэтай аднаўлення народных традыцый у іх мясцовай спецыфіцы і лакальнай своеасаблівасці. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне набывае і сама форма правядзення фестывалю, як мерапрыемства, якое мае шматфункцыянальны характар і забяспечвае творчае ўзаемадзеянне калектываў розных выканальніцкіх узроўняў.



*Калектыў ДУА "Гімназія г. Каменца", раённы дзіцячы фальклорны фестываль "Спадчына" (2007 год)*

**2.4 Мэта праекта:** падтрымка, ахова і зберажэнне самабытнай культуры Камянеччыны; прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем выхавання дзяцей і моладзі сродкамі традыцыйнай народнай творчасці; удасканаленне форм арганізацыі вольнага часу ў дзіцячай і маладзёжнай аўдыторыі; паляпшэнне ўзаемаразумення праз фальклорнае мастацтва.

**2.5 Задачы і прагназуемыя вынікі:**

| *№ п/п* | *Задачы праекта* | *Прагназуемыя вынікі* |
|---|---|---|
| 1. | Пашыраць веды ў галіне народнай спадчыны малой Радзімы праз удзел у праекце | Праз разнастайныя формы абмену вопытам паміж навучэнцамі і педагогамі, праз асваення народных песенных і харэаграфічных традыцый вырашаюцца задачы развіцця разумовай, даследчай і пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў. |
| 2. | Ствараць умовы для прафесійных зносін, самарэалізацыі і стымулявання росту творчага патэнцыялу педагогаў (у галіне “фальклор”, “беларуская мова”, “дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”) | Удзел у праекце паспрыяе передачы асабістага прафесіянальнага вопыту, аўтарскіх методык у творчай і педагагічнай дзейнасці ў сферы вывучэння рэгіянальнага аўтэнтычнага фальклору, народна-сцэнічнічнай дзейнасці і дэкаратыўна-побытавага мастацтва, дазволіць спецыялістам у галіне фальклору выпрацаваць і прапанаваць кіраўнікам калектываў канкрэтныя рэкамендацыі па ўдасканаленні іх работы. Праект створыць пляцоўкі для павышэння прафесійнага майстэрства навучэнцаў і педагогаў. |
| 3. | Развіваць творчыя здольнасці, эмацыянальную сферу навучэнцаў праз вывучэнне народнай спадчыны | Праект прадаставіць таленавітым і адораным дзецям магчымасць выхаду на шырокую аўдыторыю і створыў камфортнае асяроддзе для папулярызацыі дзіцячых фальклорных калектываў і рэалізацыі рознабаковых творчых |

| | | |
|---|---|---|
| | | здольнасцяў праз вывучэнне, зберажэнне і перайманне фальклорнай спадчыны. |
| 4. | Фарміраваць саціяльна-значныя якасці асобы культуру зносін на аснове лепшых народных традыцый | Праект паспрыяе фарміраванню ў юных дзеячаў фальклорнага мастацтва такіх якасцяў як:<br>– актыўная жыццёвая пазіцыя;<br>– унутраная патрэба ў творчасці;<br>– здольнасць разумець і шанаваць прыгажосць, уменне самастойна ствараць прыгажосць;<br>– уменне наладжваць кантакты з равеснікамі і са старэйшым пакаленнем;<br>– разуменне каштоўнасцей рэгіянальнай традыцыйнай народнай культуры;<br>– патрэба аднаўлення, захавання і папулярызацыя народных традыцый. |
| 5. | Стварыць умовы для папулярызацыі традыцый і абрадаў продкаў праз сцэнічнае ўвасабленне | Рэалізацыя праекта “Адкрыты дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына” створыць стабільную сістэму масавых мерапрыемстваў для развіцця творчых здольнасцяў дзяцей праз фальклорную дзейнасць, выявіў вядучыя фальклорныя калектывы, асобных выканаўцаў, майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці. |
| 6. | Выхоўваць патрыятызм і любоў да Радзімы, абуджаць цікавасць да фальклорнай спадчыны рэгёна і традыцыйнай культуры Беларусі | Падрыхтоўка і правядзенне адкрытага раённага фальклорнага дзіцячага фестывалю “Спадчына” дапаможа гарманізацыі грамадска-дзяржаўных адносін, а менавіта, адносін грамадства і дзяржавы да сацыяльна-актыўнага падрастаючага пакалення, як да асноўнага рухавіка народнага здабытку-традыцыйнай духоўнай культуры Беларусі. |

**2.6 Тып праекта:**

- па форме арганізацыі: творчы, практычна-арыентаваны;
- па сферы прымянення вынікаў: краязнаўча-этнаграфічны, сцэнічны, гульнёвы, дэманстрацыйны;
- па шырыні ахопу зместу: міжпрадметны (фальклор, беларуская мова, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва);
- па складдзе ўдзельнікаў: навучэнцы, педагогі, носьбіты трацыйнай культуры.

**2.7 Метады работы:**

- даследчы;
- тлумачальна-ілюстратыўны;
- рэпрадуктыўны.

**2.8 Формы работы:** даследаванне, гутаркі, самастойная работа, рэканструкцыя абрада, вакальна-ансамблевая работа, харэаграфія, дэкаратыўна-прыкладная творчасць, гульнёвая дзейнасць, канцэртная дзейнасць, майстар-классы, семінары,супастаўленне і аналіз.

**2.9 Удзельнікі праекта**

***Мэтавая група:*** навучэнцы ўстаноў адукацыі раёну (сярэднія і базавыя школы, цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі), а так сама ўсе жадаючыя калектывы фальклорнага накірунку.

***Ініцыятыўная група:*** метадысты аддзела па адукацыі Камянецкага раённага выканаўчага камітэта, педагогі ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”.

***Рабочая група:*** настаўнікі школ, кіраўнікі фальклорных калектываў, носьбіты народной культуры, спонсары.




*Урачыстае адкрыццё раённага дзіцячага фальклорнага фестывалю “Спадчына“ (2009 )*

## 3. ЗМЕСТ ПРАЕКТА

Праект з’яўляецца сістэмай кіравання творчымі працэсамі фестываля, а таксама сродкам пазнання ўнутраных нераскрытых творчых сіл дзяцей і моладзі ў фальклорным накірунку.

Для падрыхтоўкі і правядзення фестывалю ствараецца аргкамітэт з удзелам прадстаўнікоў аддзела па адукацыі Камянецкага раённага выканаўчага камітэта, ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”, аддзела па справах моладзі Камянецкага раённага выканаўчага камітэта, Высокаўскага гарадскага выканаўчага камітэта, Камянецкага раённага грамадскага культурна-асветніцкага аб’яднання “Спадчына”.

Аргкамітэт распрацоўвае і ажыццяўляе практычныя мерапрыемствы па правядзенні фестывалю, прадстаўляе кандыдатаў на фінальную імпрэзу, вызначае лаўрэатаў фестываля, усталёўвае формы іх заахвочвання, і састаўляе выніковыя справаздачы.

Для правядзення фестывалю распрацоўваецца палажэнне. Яно ўключае мэты і задачы фестывалю, заснавальнікаў, арганізатараў і ўдзельнікаў фестывалю; парадак правядзення, асноўныя яго этапы і мерапрыемствы, склад журы, крытэрыі адзнак, заахвочванне пераможцаў, сродкі фінансафання. Аргкамітэт распрацоўвае агульныя рэкамендацыі па правядзенні фестывалю, а таксама зацвярджае ўмовы ўдзелу калектываў і выканаўцаў у папярэдніх конкурстых выступленнях, у заключнай імпрэзе фестывалю, сцвярджае склад журы.

У якасці крытэрыяў ацэнкі прапануецца выкарыстоўваць ступень выканальніцкага майстэрства ўдзельнікаў, канчатковы “сцэнічны” вынік працы фальклорнага калектыву і якасць яго паўсядзённай працы, стабільнасць складу, узровень рашэння ў калектыве адукацыйных задач.

Крытэрыі адзнак конкурсных праграм:

- ідэйна-мастацкі ўзровень выступленняў;
- ступень выканальніцкага майстэрства;
- якасць паўсядзённым працы калектыву, канкурсанта;
- стабільнасць складу, выступленні.

Падчас ацэнкі конкурсных выступленняў фальклорных калектываў агульныя крытэрыі павінны быць дапоўнены спецыфічнымі:

- адлюстраванне ў рэпертуары мясцовага матэрыялу;
- адпаведнасць стылю выканання народнай традыцыі;
- ступень валодання імправізацыйнымі прыёмамі народнага выканальніцтва;
- ступень прафесійнай адпрацаванасці фальклорнага матэрыялу;
- этнічная чысціня прайгравання;
- якасць выканання;
- сцэнічнае ўвасабленне фальклору.

Акрамя гэтага, арганізацыйная работа накіравана на практычную рэалізацыю адразу некалькіх задач.

Па-першае, неабходна знайсці будучых удзельнікаў конкурсу. Падчас гэтай кампаніі ўжываецца як масавая, так і індывідуальная работа: можна выкарыстоўваць запрашэнні, улёткі, стэнды, радыё – выбар сродкаў залежыць ад маштабнасці фесталю і ад традыцый кожнай канкрэтнай установы адукацыі. Галоўнае зрабіць так, каб жадаючых было шмат.




*Урачыстае адкрыццё фестываля "Спадчына" (2011 год)*

Па-другое, важна паклапаціцца аб наяўнасці матэрыялаў і інструментаў: гукаўзмацняльнай апаратуры, сталоў і стэндаў для выставы, актавай залы, дыпломаў, прызоў і падарункаў. Калі матэрыяльнае забеспячэнне павінны ўзяць на сябе самі ўдзельнікі, дадзенае пытанне агаворваецца ў палажэнні фестывалю.

Па-трэцяе, арганізатары павінны запрасіць для ацэнкі вынікаў конкурсных праграм і выставы кампетэнтнае журы.

## 4. ПЛАН РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТА

1. Стварэнне аргкамітэта фестываля – студзень 2022.
2. Напісанне палажэння – верасень-кастрычнік 2021.
3. Правядзенне кансультацый па фальклорнаму напрамку і дэкаратыўна-побытаваму мастацтву для настаўнікаў, педагогаў дадатковай адукацыі і кіраўнікой фальклорных калектываў – на працягу рэалізацыі праекту (2021/2022 год).
4. Правядзенне сумесных майстар-класаў па фальклору і дэкаратыўна-прыкладной творчасці для дзяцей і моладзі: тэарэтычны курс: разбор выступленняў, падрыхтоўка ўдзельнікаў да конкурсных выступленняў па асноўных намінацыях, рэпертуарная палітыка і т. д.; практычны курс: творчыя абмены вопытам, сумесныя абмеркавання і т. д. – на працягу рэалізацыі праекта (2021/2022 год).
5. Правядзенне фальклорных экспедыцый удзельнікамі фестывалю: студзень 2021 года –верасень 2021 года.
6. Апрацоўка матэрыялаў фальклорных экспедыцый – чэрвень-верасень 2021 года.
7. Падрыхтоўка конкурсных праграм – кастрычнік-снежань 2021 года.
8. Падрыхтоўка выстаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці – верасень-кастрычнік 2021 года.
9. Адборачныя туры адкрытага дзіцячага фальклорнага фестывалю "Спадчына" – студзень 2022 года;

10. раённы вэбінар для педагогаў дадатковай адукацыі, кіраўнікоў фальклорных калектываў, метадыстаў па тэме “Традыцыі адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод” у сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі” – 27 студзеня 2022 г.).

11. Фінальная імпрэза адкрытага дзіцячага фальклорнага фестывалю “Спадчына” – 5 лютага 2022 года.

12. Маніторынг правядзення фестывальных мерапрыемств, планаванне наступнага фестывалю – люты-красавік 2022 года.

## 5. САЦЫЯЛЬНАЕ ПАРТНЁРСТВА

У якасці сацыяльных партнёраў пры рэалізацыі праекта далучаюцца аддзел па справах моладзі Камянецкага раённага выканаўчага камітэта, Высокаўскі гарадскі выканаўчы камітэт, УА “Высокаўскі дзяржаўны сельска-гаспадарчы прафесійна-тэхнічны каледж”, ДУА “Высокаўская сярэдняя школа” Камянецкага раёна, а таксама спонсары з ліку арганізацый Камянецкага раёна і індывідуальных прадпрымальнікаў.

## 6. ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНАЕ АБГРУНТАВАННЕ ПРАЕКТА

Для рэалізацыі праекта неабходна ўключыць наступныя артыкулы выдаткаў:

- на пражыванне;
- на харчаванне;
- на транспартныя выдаткі;
- на культурную праграму;
- на выданне друкаванай прадукцыі;
- для вырабу атрыбутыкі і іншых матэрыялаў;
- для набыцця прызоў і падарункаў.

Дзяржаўныя, грамадскія і бізнес арганізацыі маюць права заснаваць спонсарскую дапамогу для рэалізацыі праекта па ўзгадненні з аргкамітэтам.

## 7. МАНІТОРЫНГ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТА

1. Маніторынг праводзіўся арганізацыйным камітэтам фестывалю па наступным крытэрям ацэнкі: эфектыўнасць; выніковасць; ўздзеянне; значнасць.

2. Маніторынг планаваўся ў тры этапы: папярэдні, бягучы, заключны.

Папярэдні кантроль закранаў рэсурснае забеспячэнне праекта (кадравыя, матэрыяльныя і фінансавыя рэсурсы) і ажыццяўляўся да фактычнага пачатку дзеяння праекта. Па



*Майстар-клас па побытавым танцам*

рэзультатах папярэдняга маніторынгу, які праводзіўся у пачатку верасня 2021 года, выявілался, што рэсурсаў для правядзення фестывалю дастаткова.

Бягучы кантроль уключаў: кантроль часу (правядзенне мерапрыемств фестываля ў зададзеныя тэрміны); кантроль бюджэту (узровень расходавання фінансавых сродкаў); кантроль якасці правядзення мерапрыемств.

***Маніторынг наведвальнасці фінальнай імпрэзы фестываля “Спадчына”***




Зыходзячы з графіка колькасці ўдзельнікаў заключнай імпрэзы, папулярнасць фестывалю “Спадчына” ўзрасла.

На працягу рэалізацыі праекта праведена 2 майстар-класа для педагогаў па побытавым танцам і спевам (24 красавіка 2021 года, 23 студзеня 2022 года), у якіх прынялі ўдел 25 педагогаў. 26 красавіка 2021 адбыўся міжрэгіянальны майстар-клас “Вывучэнне велікодных традыцый Камянецкага раёна” (35 педагогаў). На базах школ раёна праведзены 5 майстар-классаў па вырабу традыцыйных беларускіх лялек і па роспісу велікодных яек. Гэтыя паказчыкі таксама падвысіліся ў параўнанні з папярэднімі.

Заключны кантроль праводзіцца для атрымання ацэнкі рэалізацыі праекта ў цэлым і ажыццяўляецца на стадыі завяршэння праекта. На гэтай стадыі абагульняецца атрыманы вопыт, каб выкарыстоўваць яго для ўдасканалення пры рэалізацыі праекта ў далейшым.

Фінальная імпрэза фестываля, якая планавалась 5 лютага 2023, у сувязі з неспрыяльным эпідэміялагічным становішчам была праведзена у завочнай форме (аналітычная справаздача – дадатак № 3).



*Міжрэгіянальны майстар-клас “Вывучэнне велікодных традыцый Камянецкага раёна”*

У справаздачнай інфармацыі па рэзультатах маніторынгу адлюстраваны наступныя моманты:

- фактычнае выкананне запланаваных мерапрыемств фестываля;
- адпаведнасць прагназуемых вынікаў;
- ацэнка адхіленняў ад прагназуемых вынікаў;
- аналіз расходавання фінансавых сродкаў;
- выяўленне прычын, якія негатыўна ўплывалі на рэалізацыю праекта.

Справаздачы складаюцца не толькі для таго, каб ацаніць мінулыя падзеі, але і прадбачыць магчымыя будучыя сітуацыі. Выяўленыя ў ходзе кантролю адхіленні дазваляюць ліквідаваць выяўленыя памылкі і забяспечаць дасягненне пастаўленых мэтаў праекта.

## 7. ПАТЭНЦЫЯЛ РАЗВІЦЦЯ ПРАЕКТА

Патэнцыял развіцця праекта “Адкрыты дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына”:

- павелічэнне колькасці і пашырэння геаграфіі ўдзельнікаў мерапрыемства;
- аказанне дабратворнага ўплыву на стварэнне творчай міжнацыянальнай садружнасці;
- пашырэнне творчых сувязяў і абмен новымі ідэямі ў галіне выхавання праз далучэнне да культурнай спадчыны;
- павышэнне прафесійнага ўзроўню кіраўнікоў фальклорных калектываў і педагогаў дадатковай адукацыі;
- развіццё турызму.

Вывучэнне рэгіянальных культурных традыцый, прадметаў побыту і абрадавых дзеянняў, работа над лексікай дыялектнай мовы стварае ўмовы для фарміравання самасвядомасці асобы, яе маральных асноў, патрыятычных пачуццяў. Работа над праблемай праекта служыць развіццю разумовай дзейнасці навучэнцаў, звязнага, лагічна пабудаванага маўлення, узбагачае лексічны запас мовы, развівае камунікатыўныя здольнасці, далучае навучэнцаў да даследчай і творчай дзейнасці, пабуджае да зберажэння спадчыны.





*Раённы дзіцячы фальклорны фестываль “Спадчына” (2017 год)*

## ЛІТАРАТУРА


1. Булойчык, Л.Л. Выхаванне на традыцыях беларускай народнай культуры / Л.Л. Булойчык // Пазашкольнае выхаванне. – 2005. — № 3. – С. 43-44.
2. Клецова, О.А. Образовательные программы музыкальных и хореографических объединений внешкольного воспитания и обучения / состав.О.А. Клецова– Минск, 2009. – 210 с.
3. Крыўко, Т.М. Этнакультурнае выхаванне: аб'яднанні па інтарэсах фальклорнага накірунку / Т.М. Крыўко // Выхаванне і дадатковая адукацыя. – 2013. – № 1. – С. 21-24.
4. Культурная спадчына беларусаў як аснова грамадзянска-патрыятычнага выхавання навучэнчаў: вопыт Брэсцкага рэгіёна: зборнік метадычных і практычных матэрыялаў / склад. Т.М. Крыўко. – Мінск: НЦМТДМ, 2013. – 136 с.
5. Радавод: зборнік матэрыялаў I і II фестываляў фальклорнага мастацтва "Радавод" і абласной навукова-практычнай канферэнцыі "Я слаўлю матчын край – Радзіму Беларусь" / склад. В.Р. Волкава. – Брэст: Альтэрнатива. – 2007. – 268 с.
6. ИНФОУРОК [Электронный ресурс] / Ведущий образовательный портал России. - Смоленск, - Режим доступа: https://infourok.ru/metodicheskaya-rekomendaciya-proektnaya-deyatelnost-obuchayuschihsya-v-dopolnitelnom-obrazovanii-1072371.html - Дата доступа: 21.11.2022
7. Студопедия [Электронный ресурс] / studopedia.org - Студопедия.Орг - 2014-2019 год, - Режим доступа: https://studopedia.org/11-76758.html - Дата доступа: 31.01.2019






*Раённы дзіцячы фальклорны фестываль "Спадчына" (2019 год)*

**ДАДАТАК 1**

**Палажэнне**
**аб правядзенні раённага дзіцячага фальклорнага фестывалю “Спадчына – 2022” у рамках VIII адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод”**

**I. Агульнае палажэнне**

Раённы дзіцячы фальклорны фестываль «Спадчына» (далей – Фестываль) праводзіцца як адборачны тур у рамках VIII адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод” згодна з календаром асноўных массавых мерапрыемстваў з навучэнцамі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, устаноў прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, планам работы галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама на 2021/2022 год.

**II. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца:**

***Мэта:*** стварэнне ўмоў дзеля падтрымкі, аховы і зберажэння самабытнай культуры Камянеччыны, папулярызацыі яе сярод дзяцей і моладзі, ажыцяўленне дыялогу культур паміж рознымі пакаленнямі.

***Задачы:***

– прыцягненне ўвагі грамадскасці да праблем выхавання дзяцей і моладзі сродкамі традыцынай народнай творчасці;
– удасканаленне форм арганізацыі вольнага часу ў дзіцяча-маладзёжным асяроддзі;
– узаемаўзбагачэнне славянскіх культур праз зносіны дзяцей і моладзі;
– абмен ідэямі і ведамі, паляпшэнне ўзаемаразумення паміж прадстаўнікамі розных пакаленняў і нацыянальнасцей праз фальклорнае мастацтва.

**III. Заснавальнікамі і арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца:**

– аддзел па адукацыі Камянецкага раённага выканаўчага камітэта;
– дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”;
– Высокаўскі гарадскі выканаўчы камітэт.

**IV. Удзельнікі Фестывалю –** асобныя выканаўцы і калектывы ўстаноў адукацыі.

**V. Умовы і парадак правядзення Фестывалю.**

Фестываль праводзіцца ў 3 туры на працягу студзеня-сакавіка 2022 года.

Першы этап (ва ўстановах адукацыі) ***з 02 студзеня 2022 года па 21 лютага 2022 года –*** падрыхтоўка:

- конкурснай праграмы: фальклорныя песні, танцы, абрады, паданні, гульні, вусная народная творчасць (да 20 хвілін);
- выставы дэкаратыўна-прыкладной творчасці: творы навучэнцаў, выкананыя на падставе традыцыйных рамесстваў рэгіёну – саломапляценне, пляценне з лазы, разьба па дрэву, вышыўка, ткацтва, вязанне, ганчарства, выцінанка і інш.;
- выстава аўтэнтычных рэчаў “Музейны куток” (вырабы, рэчы, прылады працы, сабраныя па выніках фальклорна-этнаграфічных экспедыцый);
- майстар-класа навучэнцаў-майстроў народных промыслаў (ганчарства, саломапляценне, ткацтва, вышыўка, роспіс па шклу, валянне валёнкаў, пляценне кошыкаў і інш.), навучэнцаў-майстроў з удзелам носьбітаў (народных майстроў свайго рэгіёну);
- конкурсу “Бабуліна кухня” – стравы рэгіянальнай кухні;
- конкурсу дзіцячых навукова-даследчых работ “Фальклорная спадчына” (дадатак 2);
- конкурсу відэакліпаў “Берасцейская талакуха” (дадатак 3).

Заяўкі на ўдзел у фестывалі (дадатак 1) падаюцца да ***15 лютага 2022 года*** на адрас: 225080, Камянецкі р-н, г.Высокае, вул. Леніна, 81, Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г.Высокае, або па факсу 91-3-42, ці на электронны адрас cdodimvysokoye@mail.ru.

Спраўкі па телефоне 91-3-42, Зайцава Алена Мікалаеўна, Краўчук Алена Мікалаеўна.

Другі этап (адборачны) – школьныя выступы праводзяцца ***з 22.02.2022 года па 26.02.2022 года***. Ва ўстановы адукацыі будзе выязджаць журы. Графік выездаў будзе размешчаны на дошцы аб’яў адзела адукацыі, пасля паступлення заявак. На прагляд журы прадстаўляюцца конкурсныя работы па ўсіх напрамках.

У межах мэт і задач фестывалю праводзіцца раённы семінар для педагогаў дадатковай адукацыі, кіраўнікоў фальклорных калектываў, метадыстаў па тэме “Традыцыі адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод” у сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі” 27 студзеня 2022 г.)

Трэці этап – удзел калектываў, якія занялі прызавыя месцы ў раёным фестывалі “Спадчына”, у занальным аглядзе VIII адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод” 26 сакавіка 2022 года.

## VI. Крытэрыі адзнакі конкурсных праграм і выставы ДПТ:

| № | **Крытэрыі адзнакі конкурснай праграммы** | **Бал (ад 1-5 балаў )** |
|---|---|---|
| 1. | падбор матэрыялу | |
| 2. | якасць фальклорнага матэрыялу | |

| | | |
|---|---|---|
| 3. | самабытнасць | |
| 4. | артыстызм і сцэнічнае майстэрства, выканальніцкае мастацтва (песеннае, танцавальнае, музычна-інструментальнае, тэатральнае мастацтва) | |
| 5. | пераемнасць традыцый | |
| 6. | наяўнасць носьбітаў | |
| 7. | наяўнасць касцюма | |
| 8. | адпаведнасць і выкарыстанне традыцыйных касцюмаў, музычных інструментаў | |
| | **Крытэрыі адзнакі выставы ДПТ:** | |
| 1. | падбор матэрыялу | |
| 2. | якасць афармлення | |
| 3. | традыцыі ў афармленні | |
| 4. | самабытнасць і індывідуальнасць выканання | |
| 5. | выканальніцкае майстэрства | |
| 6. | вытанчанасць і эстэтычнасць | |
| 7. | этнаграфічная каштоўнасць | |
| 8. | інавацыі і традыцыі ў афармленні | |
| Агульная колькасць балаў | | |

**VII. Журы Фестывалю.**

Арганізатарамі конкурсу фарміруецца журы.

Журы конкурсу:

– распрацоўвае і зацвярджае крытэрыі ацэнкі работ;
– вызначае пераможцаў конкурсу;
– афармляе выніковую дакументацыю.

Журы прымае рашэнне на пасяджэнні і афармляе яго пратаколам.

**Дадатак 1**

**Заяўкі на ўдзел у раённым дзіцячым фальклорным фестывалі “Спадчына”**

ЗАЯЎКА – фальклорная праграма

| № | назва нумара (з указаннем носьбіта) | выканаўца (прозвішча, імя ці назва калектыву), установа, педагог, тэлефон | колькасць удзельнікаў (хлопцаў, дзяўчын) | узрост | працягласць выканання |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | | |

ЗАЯЎКА – прэзентацыя выставы

| № | Майстар-клас | | | Бабуліна кухня | | | Выстава | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | назва | педагог | навучэнцы, навучэнцы з носьбітам | назва | педагог | навучэнцы | назва | адказны |

Тэлефоны для сувязі

___

e-mail

___

Адказны за мерапрыемства________________________________________

**Дадатак 2**

**УМОВЫ**
**конкурсу дзіцячых навукова-даследчых работ “Фальклорная спадчына” па выніках фальклорна-этнаграфічных экспедыцый сваёй мясцовасці ў рамках раённага дзіцячага фальклорнага фестываля “Спадчына - 2022”**

**Мэта:** конкурс праводзіцца з мэтай падтрымкі творчасці таленавітых дзяцей і моладзі, выхавання нацыянальнай і грамадскай свядомасці, патрыятызму, зацікаўленасці творчай моладзі ў грамадска-карыснай дзейнасці.

**Задачы:**

– выхаванне любові да роднай культуры, фарміраванне каштоўных арыенціраў;
– зберажэнне мясцовых традыцый і стварэнне ўмоў па іх пераемнасці;
– выхаванне патрыятызму, умацаванне ў грамадстве высокіх маральных і эстэтычных ідэалаў;
– прапаганда нацыянальных культурных каштоўнасцей беларускага народа;
– развіццё навыкаў стварэння навукова-даследчых работ.

**Арганізатары конкурсу:**

— аддзел па адукацыі Камянецкага раённага выканаўчага камітэта;
— дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”.

**Падача конкурсных работ:** конкурсная работа дасылаецца ў ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае” ў электроным выглядзе з абавязковым надпісам “На абласны конкурс дзіцячых навукова-даследчых работ “Фальклорная спадчына”, у камп’ютарным наборы (не больш за 6 старонак, інтэрвал – 1,0; тэкставы рэдактар, кегель – 15; шрыфт – Times New Roman) у перыяд з 7 лютага 2022 года да 1 сакавіка 2022 года на электронную пошту cdodimvysokoye@mail.ru. Для ўдзелу ў конкурсе дасылаецца заяўка з наступнымі звесткамі:

- прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку;
- узрост;
- фота аўтара;
- прозвішча, імя, імя па бацьку педагога;
- установа адукацыі;
- адрас установы адукацыі;
- нумары стацыянарнага /мабільнага тэлефонаў;
- адрас электроннай пошты.

*Работы, якія не адпавядаюць дадзеным умовам або паступілі пазней вызначаных тэрмінаў, да ўдзелу ў конкурсе не допускаюцца.

**Удзельнікі конкурсу:** навучэнцы ўстаноў базавай ці агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Камянецкага раёна.

**Патрабаванні:** навукова-даследчая работа ўключае ў сябе даследаванне і вывучэнне навучэнцамі фальклорнай спадчыны свайго краю *(апісанне самабытных абрадаў, звычаяў, абрадава-святочнага касцюма, традыцыйнага строя, гісторыка-бытавога касцюма, мясцовых абрадава-святочных гульняў, карагодаў, танцаў, песень)* харэаграфічнага, музычнага, народна-песеннага і народна-інструментальнага фальклорнага мастацтва, празаічных жанраў, традыцыйных рамёстваў і іншай фальклорнай спадчыны свайго рэгіёна.

**Асноўнымі крытэрыямі адзнакі конкурсных работ з’яўляюцца:**

– адпаведнасць прадстаўленай конкурснай работы тэме конкурсу;
– змест аўтэнтычнага матэрыялу;
– паэтапнае даследаванне тэмы і выснова;
– фотаздымкі або відэазапісы фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі свайго рэгіёна.

Для падвядзення вынікаў конкурсу і вызначэння пераможцаў фарміруецца журы, склад якога вызначаюць арганізацыйны камітэт раённага дзіцячага фальклорнага фестываля “Спадчына - 2022”. Рашэннем журы вызначаюцца лепшыя конкурсныя работы, аўтары якіх прымуць удзел у VIII адкрытым абласным фестывалі фальклорнага мастацтва “Радавод”.

**Дадатак 3**

**Умовы**
**раённага этапу конкурса відэакліпаў “Берасцейская талакуха” па выніках творчай дзейнасці фальклорных калектываў у рамках VIII абласнога адкрытага фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”**

**Мэта:** садзейнічанне павышэнню творчага ўзроўню навучэнцаў праз выразныя сродкі відэамастацтва, выхаванню нацыянальнай і грамадскай свядомасці.

**Задачы:**

– прапаганда нацыянальных, мясцовых фальклорных традыцый;
– прэзентацыя фальклорных калектываў сістэмы адукацыі Брэсцкай вобласці;
– выхаванне любові да культурнай спадчыны малой Радзімы.

**Арганізатары конкурсу:**

— аддзел па адукацыі Камянецкага раённага выканаўчага камітэта;
— дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”.

**Тэрмін правядзення:**

1 лютага 2022 года – 25 красавіка 2022 года.

**Арганізатары конкурсу:**

— аддзел па адукацыі Камянецкага раённага выканаўчага камітэта;
— дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”.

**Асноўныя крытэрыі адзнакі:**

- выкарыстанне аўтэнтычнага фальклорнага матэрыяла;
- узровень выканаўчага майстэрства;
- артыстызм, музычнасць, выразнасць;
- наяўнасць носьбіта;
- касцюмы і рэквізіт;
- рэжысёрска-пастановачная работа.

**Патрабаванні:** відэакліп фальклорнага калектыву, саліста павінен быць працягласцю ад 1 да 5 хвілін, з’яўляецца вынікам яго творчай дзейнасці; відэакліп здымаецца любымі тэхнічнымі сродкамі з фальклорнага матэрыялу: на песню, танец, тэатр моды, гульню, забаўлянку, музычны твор.

**Намінацыі:**

- відэакліп на аснове аўтэнтычнага фальклору з носьбітам;
- відэакліп на аснове традыцыйна-абрадавай дзейнасці;
- відэакліп у стылі фольк-мадэрн.

**Патрабаванні:**

- павінен мець інфармацыйную застаўку з назвай твора і аўтара;
- відэакліп дасылаецца ў ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае” (з паметкай “На конкурс відэакліпаў “Берасцейская талакуха” у выглядзе зпасылкі на Яндэкс-дыск).

Заяўка дасылаецца разам з кліпам.

| № п/п | Назва кліпа | Назва аб’яднання/ Прозвішча, імя навучэнца | Установа адукацыі | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога |
|---|---|---|---|---|

Для падвядзення вынікаў конкурсу і вызначэння пераможцаў фарміруецца журы, склад якога вызначае арганізацыйны камітэт раённага дзіцячага фальклорнага фестываля “Спадчына - 2022”.

Рашэннем журы вызначаюцца лепшыя відэакліпы, якія будуць узнагароджаны дыпломамі I, II, III ступені, творы пераможцаў увайдуць у зборнік відэакліпаў конкурсу “Берасцейская талакуха” і будуць прэзентаваны на VIII адкрытым абласным фестывалі фальклорнага мастацтва “Радавод” ў маі 2022 года.

**ДАДАТАК 2**

# МАЙСТАР-КЛАС У РАМКАХ ПРАЕКТА “ГУЛЯННЕ НА ВЭЛЫКДЭНЬ”

  

**Зайцава Алена Мікалаеўна,** *педагог дадатковай адукацыі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі;* **Краўчук Алена Мікалаеўна,** *педагог дадатковай адукацыі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі;* **Сафроненка Наталля Анатольеўна,** *балетмайстар – узорны клуб аматараў фальклору “Катрынка” ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”.*

***Тэма:*** метадычныя прыёмы пераймання, зберажэння і перадачы рэгіянальнай народнай творчасці.

***Мэта:*** перадача асабістага прафесіянальнага вопыту, аўтарскіх методык у творчай і педагагічнай дзейнасці ў сферы вывучэння рэгіянальнага аўтэнтычнага фальклору Заходняга Прыгранічча.

***Задачы***:

– пазнаёміць з прадуктыўнымі методыкамі і тэхналогіямі трансляцыі Вялікодных святочна-абрадавых традыцый Заходняга Прыгранічча і творчай дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах у накірунку музычны фальклор;
– стварыць умовы для прафесійный зносін, самарэалізацыі і стымулявання росту творчага патэнцыялу педагогаў;
– перадаць вопыт праз прамы і каментаваны паказ паслядоўных дзей і прыёмаў педагагічнай дзейнасці;
– удасканаліць этнакультурныя кампетэнцыі праз удзел у майстар-класе.

***Прагназуемыя вынікі***

Па выніках майстар-класа ўдзельнікі

*будуць мець:*

– уяўленне аб творчай дзейнасці узорнага клуба аматараў фальклору “Катрынка”;
– уяўленне аб асаблівасцях рэгіянальнага фальклору;

*ведаць:*

– семантыку вялікодных святочна-абрадавых дзей;

*умець:*

– выконваць рэгіянальную Вялікодную песню і рэгіянальныя побытавыя танцы.

**План майстар-класа**

1. Уступная частка: знаёмства з узорным клубам аматараў фальклору “Катрынка” і асаблівасцямі Вялікодных рэгіянальных традыцый Заходняга Прыгранічча.
2. Деманстрацыйная частка: праграма “Гулянне на Вэлыкдэнь” ўзорнага клуба аматараў фальклору “Катрынка”.
3. Практычная частка: развучванне песні “Чэрвоное коко” і этнадыскатэка.
4. Падвядзенне вынікаў майстар-класа.

**1. Уступная частка**

Клуб аматараў фальклору “Катрынка” створаны ў 2000 годзе.

У 2005 годзе клуб аматараў фальклору “Катрынка” атрымаў званне “ўзорны”.

Дзейнасць клуба накіравана на пошук мясцовых песень, танцаў і абрадаў для наступнай апрацоўкі і выканання. Цесная сувязь з носьбітамі дае магчымасць папаўняць рэпертуар клуба новым цікавым матэрыялам.

Вучэбна-выхаваўчая работа клуба аматараў фальклору будуецца на вывучэнні рэгіянальнага фальклору. Арганізоўваюцца і праводзяцца экспедыцыі і паходы, вядзецца запіс мясцовых абрадаў, звычаяў, гульняў, песень, вывучаецца лад жыцця, асаблівасці касцюма і дыялекта, вядзецца збор экспанатаў для папаўнення экспазіцыі музейнага пакою “Беларуская хатка”.

Спачатку збор фальклорнага матэрыялу адбываўся ў час правядзення турыстка-краязнаўчых лагерных змен у вёсках Ваўкаставец, Амельянец, Бобінка. Таксама мы пачалі працаваць у цесным кантакце з настаўнікамі навакольных школ, якія дапамагалі нам у пошуках носьбітаў. Падчас зносін з носьбітамі ў рэпертуары калекыва з’явіліся побытавыя рэгіянальныя танцы і вусная народная творчасць.

Носьбітамі калектыва з’яўляюцца жыхары весак Камянецкага раена: Гайдукевіч Вера Іванаўна, 1932 г.н., в.Дубраўцы, Краўчук Любоў Іванаўна, 1933 г.н., в. Бобінка, Бялюк Вера Рыгораўна, 1932 г.н, г. Высокае, Краўчук Раіса Дзмітрыеўна, 1950 г.н., г. Высокае, Клімук Ганна Рыгораўна, 1936 г.н, в.Наваселкі, Пацыкайлік Галіна Паўлаўна, 1936 г.н., в.Ставы, Кухта Вера Івановна, 1938 г.н., в. Амельянец, Нічыпарук Вера Андрэеўна, 1934 г.н., Рэспубліка Польша, гміна Клешчэлі, в. Маліннікі, Галенка Вольга Іванаўна, 1929 г.н. і Галенка Пётр Андрэевіч, 1931 г.н.,в. Ваўкаставец, Яўдалюк Ніна Сцяпанаўна, 1933 г.н., Рэспубліка Польша, гміна Клешчэлі, в. Дабравода.

Мы жывем на тэрыторыі, дзе гістарычна склалася так, што менавіта тут адбылося змяшэнне розных культур: беларускай, польскай, украінскай і рускай. Падчас этнаграфічнай экспедыцыі у вёску Такары, якая знаходзіцца ў трох кіламетрах ад горада Высокае, мы даведаліся аб наступных фактах: ў

канцы 18 пачатку 19 стагоддзяў вёска распалагалася па абодвух берагах ракі Катэрка. На адным з берагоў стаяла праваслаўная Свята-Міхайлаўская царква, збудаваная ў 1816 годзе – гэта частка вёскі называлась Казаччына. На другім беразе стаяў драўляны касцёл Уздвіжання Крыжа Гасподня, і гэты бераг называўся Шляхетчына. А ў вёске Ставы, на пачатку 20 стагоддзя, на працягу тыдня магла двойчы змяніцца ўлада, і нават дзяржава, якой належала вёска. Усё гэта знайшло адбітак у рэгіянальным фальклоры. Змяшэнне культур надае самабытнасць і непаўторнасть мясцоваму дыялекту, касцюму, абрадам, песням, танцам. У нашым дыялекце можна пачуць словы з розных моў і ён больш падобны на ўкраінскую мову. А танцы… “Місяць”, “Лысы” – мелодыі рускія, “Кракавяк”, “Падыспань”, “Ойра” – польскія, а “Падэграс”, “Шлям-фокс” – зусім падобныя на шляхецкія танцы.

Рэпертуар клуба складаецца на аснове рэгіянальнага фальклора: песен – “Вэсна-красна”, “Ты вэрбонька зэлэнэнькая”. Гэта рагулькі – іх спявалі ад Пасхі да Провод. “Лэтів бусэнь чэрэз гулыцю”, “Святый Юрый, Рыгорэ” – гэта вяснянкі. Іх спявалі ад Провод да Троіцы. “Положу я кладочку дубову” – вясельная песня. А так сама ў рэпертуар клуба ўваходзяць побытавыя танцы: “Кракавяк”, “Лысы”, “Падыспань”, “Новосёлковскій вальс”, “Ставскій вальс”, “Полька-закрутуха”, “Місяць Ставскій” і “Бобінскій”. У рэпертуары калектыва ёсць так сама песня-гульня “Чорны баране” і танец-гульня “Полька-цыганочка” (назвы песень і танцаў – мясцовы дыялект).

На сённяшні дзень у рэпертуары нашага клуба больш за 50 аўтэнтычных рэгіянальных песень і танцаў. На аснове даследаваных абрадаў, песен, танцаў і гульняў былі створаны праграмы: “Піснёвэ коло”, “Шчодрый вэчур”, “Пэршый выпас”, “Вэлыкдэнь”, “Гулянне на Юр’я”, апісаны абрады “Пэрэпілка”, “Вэсілле”.

Вялікдзень – найбольш значнае свята веснавога цыклу, заканчэнне Вялікага посту, калі разам збіралася ўся радзіна, людзі імкнуліся быць асабліва шчодрымі і міласэрнымі. Вялікодны тыдзень папярэднічаў пачатку веснавых сельскагаспадарчых спраў, таму ўсе імкнуліся адпачыць.

Звычай абыходзіць двары на Вялікдзень мае вельмі старажытныя карані. Лічылі, што абыход двароў валачобнікамі прыносіць жывёле пладавітасць, на палях – ураджай, засцярогу ад розных прыродных стыхій. Падыходзычы пад вакно, валачобнікі спявалі віншавальныя валачобныя спевы. Гаспадары, да якіх прыходзілі валачобнікі, шчодра дзяліліся з імі living рознымі прысмакамі. Пасля ўсе выходзілі на вуліцу, беручы з сабою пісанкі. Людзі віталі адін аднаго, дзелячыся радасцю і святочным настроем, дзеці ладзілі разнастайныя забавы з пісанкамі, якімі «біліся» і «качалі». А моладзь ладзіла свае гулянні: гушкаліся на арэлях, якія былі амаль ў кожным двары, танцавалі, спявалі, жартавалі.

Гэтыя звычаі існавалі і ў вёсках Камянецкага раёна.

Звычай віншаваць і адорваць сваіх хрэснікаў на Вялікдзень захаваўся і да нашага часу.

***2. Дэманстрацыйная частка: “Гулянне на Вэлыкдэнь”***

1. ***Песня “Чэрвоное коко”.***

**Хлопцы:** Ну шо дівчата, мныго волочэбного наволокалы?

**Дзяўчаты:** Шо наволокалы, то нашэ. А вітэ?

**Хлопцы:** А мы то мныго!

**Дзяўчаты:** То можэ з намы поділэтэся?

**Хлопцы:** Як дастэ буськы – то поділымось!

**Дзяўчаты:** Шэ чого ны було! Гэть здурілы? Шэ мы тулько з вамы ны цыловалыся!

**Хлопцы:** Ну то хоть потанцюйтэ!

**Дзяўчаты:** Потанцёваты можна!

2. ***Танец “Вальс Новосёлковскый”***
3. ***Песня “Не ходзь коло ружы”***
4. ***Песня “Чорный баране”***
5. ***Песня “Вэсна-красна”***

***Словы:*** *Гэй, збэрайтэсь, хлопцы, девкы,*
*Музыканты – гучній грай!*
*Заспываем вам прыпевкы,*
*Ну, дівчата – начынай!*

6. ***Прыпевкы (песня)***

***Этнадыскатэка.***

7. ***Танец “На рэчэньку”***
8. ***Танец “Лысый Ставскый”***
9. ***Танец “Лысый Новосёлковскый”***

***Словы:*** *Ой, гармоні грайтэ!*
*Барабаны бітэ!*
*Хлопцы і дівчата*
*Танцёваты йдітэ!*

10. ***Танец “Полька-закрутуха”***
11. ***Песня “Хрыстос воскрэс”***

***Вывучаем песню “Чырвонае кока”***

***3. Этнадыскатэка: "На рэчэньку", "Лысый Ставскый", "Лысый Новосёлковскый"***

Традыцыйны беларускі побытавы танец, які яшчэ называюць фалькторным, быў распаўсюджаны калісьці ў беларускіх вёсках. На сцэнічны народны танец побытавы танец не падобны – яго вызначаюць арыгінальная для кожнага рэгіёну манера выканання і танцавальныя фігуры.

Мэта этнадыскатэкі – не столькі вывучыць вялікую колькасць танцаў, колькі навучыць удзельнікаў майстар-класа асаблівай манеры выканання побытавых танцаў. Як у народных песнях, казках, гэтак і ў танцах ў кожным рэгіёне была свая манера выканання. Кожны рэгіён мае свае асаблівасці пластычнага самавыяўлення праз танец.

Сучасным людзям не так цяжка засвоіць рухі – яны пераважна не вызначаюцца складанасцю. Значна цяжэй навучыцца традыцыйнай рэгіянальнай манеры выканання. "Не скакаць вышэй, чым трэба, не рабіць лішніх рухаў рукамі, нагамі, нават поглядам" – гэтыя дэталі патрабуюць значна больш часу.

Для структуры рэгіянальных побытавых танцаў характэрны паўтаральнасць дзвюх-трох тыповых музычна-пластычных формул, агульны для ўсіх удзельнікаў кампазіцыйны малюнак, масавае выкананне, частае песеннае суправаджэнне, неабмежаваная колькасць удзельнікаў і любы іх склад (нярэдка ў парах танчаць толькі жанчыны).

***4. Падвядзенне вынікаў***

Народная творчасць – гэта дзейсны сродак эстэтычнага выхавання, выхавання эмацыянальнай спагадлівасці на цудоўнае ў жыцці, у прыродзе, у чалавечых адносінах, выхавання мастацкага густу. У працэсе заняткаў узорнага клуба аматараў фальклору "Катрынка" паспяхова развіваюцца асноўныя музычныя здольнасці, творчая актыўнасць навучэнцаў. Народнае мастацтва валодае выключнымі магчымасцямі для выхавання каштоўнейшых маральных якасцей чалавека: пачуцця патрыятызму, працавітасці, любові да прыроды, чалавекалюбства.

Фальклор (народная мудрасць) – гэта мастацкая педагогіка. Гэта сістэма эстэтычнага выхавання дзяцей з дапамогай слова, музыкі і руху, прычым не для абраных і найбольш адораных, а для ўсіх. Таму адбор не праводзіцца, у клуб аматараў фальклору "Катрынка" прыймаюцца ўсе жадаючыя.

У рашэнні задач маральнага і эстэтычнага выхавання, развіцця творчых здольнасцяў падрастаючага пакалення мастацкай народнай творчасці адводзіцца сёння ўсё больш прыкметнае месца. Набытыя веды ў галіне фальклору даюць магчымасць глыбей спазнаць рэчаіснасць, гістарычныя і нацыянальныя асаблівасці свайго народа, далучыцца да нацыянальнай культуры і гісторыі Радзімы.

**ДАДАТАК 3**

# Аналітычная справаздача

аб правядзенні раённага дзіцячага фальклорнага фестываля “Спадчына” у рамках VIII адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод” 15 сакавіка 2022 года (першы і другі этап фестывалю “Радавод” у Камянецкім раёне)

15 сакавіка на базе Цэнтра дадатковай адукацыі прайшло пасяджэнне журы, на якім праходзіў агляд відэаматэрыялаў дасланых на IX раённага дзіцячага фальклорнага фестываля “Спадчына-2022” у рамках VIII адкрытага абластнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод” (раённы этап).

Арганізатарамі фестывалю з’яўляліся дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае”, аддзел па адукацыі Камянецкага раённага выканаўчага камітэта, Высокаўскі гарадскі выканаўчы камітэт.

Фестываль праводзіўся з 17 студзеня па 10 сакавіка 2022 года ў тры этапы.

Першы этап (ва установах адукацыі) з 17 студзеня па 21 лютага:

– падрыхтоўка конкурсных праграм (фальклорныя песні, танцы, абрады, паданні, гульні, вусная народная творчасць (да 20 хвілін);

– выставы дэкаратыўна-прыкладной творчасці: творы навучэнцаў, выкананыя на падставе традыцыйных раместваў рэгіёну – саломапляценне, пляценне з лазы, разьба па дрэву, вышыўка, ткацтва, вязанне, ганчарства, выцінанка і інш.;
– выстава аўтэнтычных рэчаў “Музейны куток” (вырабы, рэчы, прылады працы, сабраныя па выніках фальклорна-этнаграфічных экспедыцый);
– майстар-класы навучэнцаў-майстроў народных промыслаў (ганчарства, саломапляценне, ткацтва, вышыўка, роспіс па шклу, валянне валёнкаў, пляценне кошыкаў і інш.), навучэнцаў-майстроў з удзелам носьбітаў (народных майстроў свайго рэгіёну);
– конкурс “Бабуліна кухня” – стравы рэгіянальнай кухні;
– конкурс дзіцячых навукова-даследчых работ “Фальклорная спадчына”
– конкурс відэакліпаў “Берасцейская талакуха”.

Другі этап (адборачны) – школьныя выступы праводзіліся з 22.02.2022 года па 26.02.2022 года. Ва ўстановы адукацыі выязджала журы для агляда конкурсных праграмм. На астатнія намінацыі ўстановамі адукацыі былі дасланы відэа- і фотаматэрыялы.

У межах мэт і задач фестывалю праводзіўся раённы вэбінар для педагогаў дадатковай адукацыі, кіраўнікоў фальклорных калектываў, метадыстаў па тэме “Традыцыі адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод” у сістэме дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі” (27 студзеня 2022 г.).

Усяго ў фестывалі прынялі ўдзел 11 устаноў адукацыі раёна.

У намінацыі “Конкурсная праграма” выступілі калектывы 4 устаноў адукацыі раёна: Высокаўская сярэдняя школа – праграма “Летнім вечарам на равах”, Відамлянская сярэдняя школа – абрад “Вяночкі”, Каленкавіцкая базавая школа – абрад “Пасхальныя вячоркі”, Дзмітравіцкая сярэдняя школа – абрад “Каравай, мой раю”. Удзельнікі паказалі высокі ўзровень сцэнічнага майстэрства і творчы падыход. Важна адзначыць, што для таго, каб рэканструяваць традыцыйныя абрады малой радзімы педагогі разам з дзецьмі збіралі фальклорны матэр’ял, які ўвасобілі ў сваіх выступленнях.

Журы ацэньвала конкурсныя праграмы па наступных крытэрыях:

- падбор матэрыялу для выступлення;
- якасць фальклорнага матэрыялу;
- самабытнасць;
- артыстызм і сцэнічнае майстэрства, выканальніцкае мастацтва (песеннае, танцавальнае, музычна-інструментальнае, тэатральнае мастацтва);
- пераемнасць традыцый;
- наяўнасць носьбітаў;
- наяўнасць адпаведных касцюмаў;
- адпаведнасць і выкарыстанне традыцыйных касцюмаў, музычных інструментаў.

Конкурная праграма “Летнім вечарам на равах” (ДУА “Высокаўская сярэдняя школа”) ўяўляла сабой фрагмент летніх моладзевых вячорак (дыплом III ступені). Калектыў Каленкавіцкай базавай школы прадставіў праграму “Вялікодныя вячоркі” з абрадавымі дзеямі і прыказкамі, побытавымі танцамі сваёй мясцовасці (дыплом II ступені). Калектыў Дзмітравіцкай сярэдняй школы рэканструяваў абрад пячэння вясельнага караваю “Каравай, мой раю” (дыплом II ступені). Удзельнікі фальклорнага ансамбля “Вясёлка” Відамлянскай сярэдняй школы прадставілі ў конкурснай праграме абрад “Вяночкі” (дыплом I ступені). Журы асобна адзначыла казку “Пра чоловіка-бідняка і сокіру” ў выкананні Трэцякова Яўгена з ДУА “Стаўскі дзіцячы сад-базавая школа” (дыплом I ступені). Удзельнікі конкурсных праграм добра валодаюць рэгіянальным дыялектам. Знешні выгляд удзельнікаў:

касцюмы, галаўныя ўборы, прычоскі і абутак – адпавядаў зместу праграм і патрабаванням згодна палажэнню фестываля.

На занальны этап VIII адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод” адпраўлены: абрад “Вяночкі” фальклорнага ансамбля “Вясёлка” Відамлянскай сярэдняй школы, казка “Пра чоловіка-бідняка і сокіру” ў выкананні Трэцякова Яўгена з ДУА “Стаўскі дзіцячы сад-базавая школа”, “Гуканне вясны” ўзорнага фальклорнага аб’яднання “Белавежская цявінка”, “Вэсна-красна” ўзорнага клуба аматараў фальклору “Катрынка”.

У намінацыі “Майстар-клас” удзельнічалі тры ўстановы адукацыі: ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае” (майстар-клас “Роспіс па шкле” (дыплом III ступені), майстар-клас “Дыванок” (дыплом II ступені); ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Каменец” (майстар-клас “Бірулька на ключы” (дыплом II ступені), ДУА “Воўчынская сярэдняя школа” (майстар-клас “Лялька-мотанка “Званочак” (дыплом I ступені). Усе майстар-класы зроблены на падставе рэгіянальных рамёстваў і адпраўлены на занальны этап VIII адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод”.

У намінацыі “Выстава дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва” хочацца адзначыць выставу “Беларуская лялька-мотанка” ДУА “Воўчынская сярэдняя школа”, атрымаўшую дыплом I ступені. На занальным этапе VIII адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод” прадстаўлена выстава “Мір дзяцінства” Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае.

Крытэрыі адзнакі выставы дэкаратыўна-прыкладной творчасці:

– падбор матэрыялу для выставы;
– якасць афармлення;
– традыцыі ў афармленні;
– самабытнасць і індывідуальнасць выканання;
– выканальніцкае майстэрства;
– вытанчанасць і эстэтычнасць;
– этнаграфічная каштоўнасць;
– інавацыі і традыцыі ў афармленні.

У намінацыі “Музейны куток” першае месца заняў калектыў Дзмітравіцкай сярэдняй школы за экспазіцыю “Сялянская хата”, дыплом другой ступені атрымаў калектыў Стаўскога дзіцячага сада-базавай школы, на трэцім месцы – “Беларуская хата” Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае.

Лепшымі ў намінацыі "Бабуліна кухня" сталі (відэаматэрыялы адпраўлены на занальны этап VIII адкрытага абласнога фестываля фальклорнага мастацтва "Радавод"):

- дыплом III ступені – "Кісель" ДУА "Вярховіцкая сярэдняя школа",
- дыплом III ступені – "Бабуліны булкі" ДУА "Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае";
- дыплом II ступені – "Парохі" ДУА "Стаўскі дзіцячы сад-базавая школа";
- дыплом II ступені – "Вясельны хрушч" ДУА "Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае";
- дыплом I ступені – "Бульба па-дзмітравіцкі" ДУА "Дзмітравіцкая сярэдняя школа".

На конкурс "Фальклорная спадчына" прадстаўлены чатыры даследчых работы, адзначаныя дыпломамі I і II ступені: «Выцінанка: традыцыі і сучаснасць» ДУА «Вярховіцкая сярэдняя школа», «Вяселле на Камянеччыне» ДУА «Высокаўская сярэдняя школа», «Вясельны абрад на Відамляншчыне» ДУА «Відамлянская сярэдняя школа», «Святы і абрады а/г Каленкавічы» ДУА «Каленкавіцкая базавая школа». Усе работы ўдзельнічаюць у конкурсе «Фальклорная спадчына» ў рамках фестывалю «Радавод»).

Пераможцы фестывалю ўзнагароджаны дыпломамі.

**Старшыня журы**
Дырэктар ДУА "Цэнтр дадатковай
адукацыі дзяцей і моладзі г. Высокае" М.А. Дудар

Намеснік дырэктара па ВВР "Цэнтр
дадатковай адукацыі дзяцей
і моладзі г. Высокае" Т.В. Дзеркач